Вольга КАЗЛОВА

# ВУЗЕЛЬЧЫКІ ЛЁСУ

У сям'і жыхара вёскі Заграддзе, якую ў час Вялікай Айчыннай вайны напаткаў лёс Хатыні, Івана Трафімавіча Казлова, па вулічнай мянушцы Лугаўца, у пачатку XX стагоддзя гадавалася чатыры сыны: Фёдар, Васіль, Уладзімір, Павел і дачка Маша. Старэйшага Фёдара, як і прынята было ў народзе, стараліся вывесці ў людзі, паставіць на такі шлях, на якім ён мог бы не толькі сам трымацца на нагах, але і дапамагаць бацькам гадаваць малодшых братоў.

Вёска Заграддзе па ландшафце нагадвала багор. Адным канцом яна ўпіралася ў чыгунку, што злучала поўдзень і захад Расійскай імперыі, а другім — у лугавыя поймы рэчкі Беліца, спускалася ў прыгожы луг, які быў надзейным кармільцам малазямельнай сям'і Івана Трафімавіча Казлова. Лугаўцамі іх празвалі за пастаянны папасак членаў сям'і дарамі лугу: у веснавую галадуху ратавала поліўка з адскочыўшага пасля зімы шчаўя. У час выпасу жывёлы вабіў смачны дзіцячы ласунак — ружовыя пасачкі-сярэдзінкі балотнага аеру, на смак кры-




*В.В. Казлова каля Сцяга Перамогі. Музей Вялікай Айчыннай вайны. 2000 г.*

шачку салодкага. Летам асартымент дароў узбагачаўся ягадамі дзікіх ажынаў, малінаў, восенню адорваў арэшнік, каліна цешыла каляровай прыгажосцю і абяцала прысмакі да зімы, а журавіны папаўнялі сціплыя харчовыя прыпасы сям'і. Рака Беліца, чыстая, як сляза, таксама карміла і паіла мясцовы люд. А Лугаўцам яна была надзейнай памочніцай у гаспадарскіх справах. Абмывала летам і зімою. Маці Марута вазіла з хлопцамі на раку паласкаць бялізну пасля попелавай жлукты-бані ў чыгунах вясковай печы. Рэха ад лёскату драўлянага праніка, якім адбельвалі бялізну, неслася па рэчцы круглы год.



*Чырвонаармеец Васіль Казлоў. 1925 г.*

Хата Казловых, збудаваная прадзедам, стаяла на пагорку і нагадвала забытую Богам сіраціну. Маленькія вокны, мазаічна зашклёныя з рознага памеру кавалачкаў пазелянеўшага ад часу шкла, сведчылі аб свавольствах падшыванцаў Івана і Маруты Казловых. Асабліва зімою жэўжыкі-Лугаўцы пакутавалі ад жадання пакоўзацца разам з вясковай дзятвою з гары пад іх вокнамі. Валёнкі былі адны на трох хлопцаў, імі ж карысталіся па чарзе і астатнія сямейнікі. Выбягалі на «кучу малу» — вясковую зімовую гульню і ў лапціках, а падчас азарту — у закручаных на ногі анучах.

У гэтым сямейным гурце атрымаў першыя ўрокі жыцця мой бацька Васіль Іванавіч Казлоў.

Галоўнымі запаветамі для ўсіх пакаленняў Казловых былі запаветы бясспярэчнага паслушэнства бацькам, пакланенне і абарона іх аўтарытэту, клопат пра малодшых, асабліва аб адзінай у сям'і дзяўчынцы — Машы. Ёй было дазволена ўсё...

Дзед мой Іван Трафімавіч карміў-трымаў сям'ю так званымі адыходнымі заробкамі: працаваў на будаўніцтве мастоў, рамонце чыгуначнага палатна, ставіў новыя зрубы хат і гаспадарчых пабудоў. Летам увесь час быў у людзях. А зімою вяртаўся дамоў, шорнічаў, падшываў валёнкі, займаўся рамонтам чужога абутку. Ён мог дазволіць сабе пафарсіць нейкі час у адрамантаваных хромавых чужых ботах. Гаспадарка ляжала на плячах жонкі Марыі Іванаўны, па-вясковаму Маруты. Сваім аптымізмам яна была роўняй мужу. Штогодні паход на заработкі ў людзі станоўча ўплываў на развіццё дзедавага кругагляду. На зімку Іван вяртаўся ў вёску своеасаблівым прапагандыстам здабытых новых вестак дэмакратычна-палітычнага характару. Хата Лугаўцоў ператваралася ў вясковы дыскусійны клуб, стаяла яна наводшыбе, наводдаль ад чужога вока. Яна была адчынена для старых і маладых. Тут дазволена было насмактацца казіных ножак тытуню з самасаду, прызначыць калектыўныя папрадкі кудзелі, воўны, а ў дні святочныя дазвалялі моладзі паскакаць да ўпаду пад гармонік. Марута не шкадавала падлогі, якая дажывала свой век, і не было за што турбавацца. Яна любіла мо-

ладзь за добрасардэчную кантактнасць, за пявучы голас, за карагодлівасць характару. Сярод сваіх аднавяскоўцаў яна вылучалася хуткай рэакцыяй на ўсе новыя сацыяльна-палітычныя павевы часу. Без усялякай аглядкі на ўзрост яна прымала актыўны ўдзел у вясковых сходках, зборышчах, прыстасоўвала свой знешні выгляд да пафасу кастрычніцкіх падзей: магла ўпрыгожыць куксу валасоў чырвонай стужкай, змайстраваць і прышчапіць на халадайку чырвоны банцік. У паводзінах для вясковага этыкету была жанчынай раскаванай. Памятаю — у час акучвання бульбы смела падстаўляла свае сухарлявыя плечы пад сонечную спякоту, а галаву хавала ў маю гарадскую белую дзіцячую панамку.

У бабулі Маруты на жэрдачцы каля палацяў ва ўсе поры года вісеў пакуначак белых гарбузікаў і арэхаў — «энзэ»-гасцінчык для ўнучкі, а летам частавала кукурузнымі кіяхамі, вішнямі і садавінай.

Марута трымала сваіх сыноў у строгасці. Гаспадарка была слабая: кароўка непародзістая, свінні не вяліся. Яйкі мяняла ў вясковага купца Мэндаля на соль і мыла. Але Лугаўцы не скардзіліся на свой лёс і паводзілі сябе сярод аднавяскоўцаў з пачуццём роўных сярод роўных.

Маці, як сказалі б цяпер, клапацілася пра імідж сваіх сыноў. Помніцца пра тое, як яна апранала іх. Аднойчы купіла скупую меру корту на порткі сынам. Прынесла пашыць вясковаму майстру-шаўцу Бэрку. Змераўшы матэрыял, ён засведчыў, што яго не хапае. Марута пярэчанні адмяла і прымусіла сваімі довадамі Бэрку выканаць «заказ». Хлопцы атрымалі падштанікі-дудкі, якія распаўзліся на іх за адзін тыдзень. Марута богатварыла сваіх сыноў, і было за што! Кволую гаспадарку цягнула з іх дапамогай, але ад школы не адпрэчвала. Лічыла за гонар мець вучняў у хаце.

З велізарнейшым пачуццём удзячнасці расказваў бацька пра сваю першую настаўніцу Вольгу Сцяпанаўну Багдановіч. Працавала яна ў школьным пакойчыку адразу з чатырма групамі дзяцей markdown рознага ўзросту, падзеленых на чатыры класы. Кожная група займала некалькі партаў у адным з куткоў пакоя. Заданні атрымлівалі разлічаныя на ўзрост, а затым здавалі настаўніцы індывідуальнае іх выкананне. Каля Вольгі Сцяпанаўны была выгараджана чыстая маснічная пляцоўка, куды дзецям самавольна нават у час перапынку не дазвалялася ступаць. Гразі на іх лапцях было дастаткова. Падлогу мылі штодзень дзяўчынкі, а печ-грубку даглядалі хлопцы. Вучні любаваліся прыгажосцю і далікатнасцю настаўніцы, захапляліся яе ўборамі і лічылі за шчасце прынесці ёй вядро вады, вязанку дроў, кош бульбы.

Школа, народная асвета і настаўніцтва для В. Казлова былі пашанотнымі з дзён маленства. Жыццё падаравала яму нечаканы выпадак — пасля ваеннага ліхалецця і адлегласці ў 30 год адшукаць падчас службовай камандзіроўкі на Гомельшчыну Вольгу Сцяпанаўну Багдановіч, настаўніцу Заградскай школы пад Жлобінам. Яна адчыніла яму акно ў вялікі свет. У мірны час паспеў папрацаваць Казлоў з былой настаўніцай на ніве дэпутацкай. З'яўляючыся старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, уручыў за вялікія заслугі перад Радзімай сваёй былой настаўніцы ўрадавую ўзнагароду — ордэн Леніна.

З пачаткам першай сусветнай вайны закончыў Казлоў першую ступень сваёй адукацыі.

Кожны з членаў сям'і Казловых быў надзелены адметнымі рысамі характару, індывідуальнымі здольнасцямі. З ранніх год пасяліўся ў маю памяць вобраз брата бацькі Уладзіміра. Па ўспамінах маці, Ефрасінні Яфімаўны, Валодзя быў маёй пяшчотнай нянькай. Ён вельмі ўважліва паставіўся да яе — першай нявесткі ў сям'і Казловых — і з замілаваннем адносіўся да немаўляткі-пляменніцы Волечкі. Так у час жніва Фрося не магла лішні раз кінуць серп і суняць плач дачушкі, што пяклася пад сонцам у таганах на полі. Валодзя быў і на падхваце, і на варце. Ён першы кідаўся да дзіцяці, пачуўшы яго плач, мяняў мокрыя пялюшкі, паіў вадзічкай, гатаваў суслу альбо браў пляменніцу на рукі і прыкладаў яе губкі да пупліка сваіх мужчынскіх грудзей. Немаўлятка ад пустога чмокання стамлялася і засынала.



*В. І. Казлоў з жонкай Е. Я. Казловай, дочкамі Тамарай і Вольгай. Масква. 1943 г.*

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гады праз два, восенню, калі скарадзілі бульбяное поле, дзядзька Валодзя кідаў на барану, якую цягнулі коні, жмут-падсцілку сухога бульбяніку і з рызыкай для сябе, пляменніцы і яе маці садзіў на верх бараны сваю любіміцу Вольку.

У Валодзі, як і ў яго бацькі, былі залатыя рукі. Першыя цацкі майго дзяцінства змайстраваныя ім. Вясковыя дзеці летам з шумам вазілі мяне і каталіся самі на чатырохкалёснай драўлянай калясцы, змайстраванай дзядзькам. Зімою маці праз усю вуліцу цягнула прыгожа аздобленыя рознымі конікамі саначкі, таксама зробленыя для пляменніцы рукамі і фантазіяй Валодзі. Драўляны сярпок, грабелькі для вызвалення ад трэсак і саломы жэўжыка-ручайка, што вясною і ў час дажджу весела імчаў з гары каля дома Лугаўцоў у пойму ракі, таксама яго клопат. На Вялікдзень Валодзя падараваў цуда-яйка, запоўненае цяжкім рэчывам, дзюбачкай якога я хітра ў час гульні ў біткі збірала ў прыпол сукенкі выйгрыш ад сваіх аднагодак.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы